ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 117 (1084) ЧАЦЬВЕР, 22-га мая 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . . 30 кап.
3 месяцы . . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.
Кошт асобнага №—2 кап.

Пастанова сэкратарыяту ЦК КП(б)Б

Заслухаўшы паведамленьне сэктару друку культпропу ЦК КП(б)Б, адзначыць надзвычайна важнае палітычнае значэньне ўмовы аб соцыялістычным спаборніцтве паміж газэтамі БССР і Заходняй вобласьці па пытаньнях падрыхтоўкі і асьвятленьня Ўсесаюзнага Зьезду ЎсеКП(б). Абавязаць усе рэдакцыі цэнтральных і акруговых газэт прыняць самыя энэргічныя і ініцыятыўныя захады на забясьпечаньне поўнага выкананьня ўмовы аб соцспаборніцтве.

Абавязаць усе партыйныя організацыі, партчасткі, гаспадарчыя, профсаюзныя і савецкія ўстановы і організацыі Беларусі забясьпечыць поўную дапамогу цэнтральным, акруговым і фабрычна заводзкім газэтам у справе падрыхтоўкі і праведзеньня масавых організацыйных мерапрыемстваў, зьвязаных з падрыхтоўкай да надыходзячых партыйных зьездаў.

Для дапамогі рэдакцыям цэнтральных газэт у праведзеньні падрыхтоўкі да Ўсебеларускага і Ўсесаюзнага зьездаў партыі мобілізаваць на месяц 60 чалавек.

Праведзеньне падбору 60 чалавек даручыць у адпаведны тэрмін камісіі ў складзе т. т. Баля, Будзінскага і Курціка. Сьпіс камандыраваных зацьвердзіць на сэкратарыяце ЦК КП(б)Б.

Зацьвердзіць пасылку дэлегацыі ад друку БССР у Смаленск. Пэрсональны склад дэлегацыі даручыць скласьці сэктару друку Культпропу ЦК КП(б)Б.

Пачаць у цэнтральных і акруговых газэтах Беларусі шырокае асьвятленьне падрыхтоўкі да партыйных зьездаў Заходняй вобласьці і ходу спаборніцтва паміж друкам БССР і газэтамі Заходняй вобласьці.

Дагавор па соцыялістычным спаборніцтве цэнтральных газэт БССР

на лепшую організацыю газэтнага паходу, падрыхтоўкі, асьвятленьня і праработкі рашэньняў XVI партзьезду ЎсеКП(б)

Цэнтральныя газэты БССР — „Зьвязда“, „Рабочий“, „Савецкая Беларусь“ і „Беларуская Вёска“ прымаюць на сябе і выклікаюць усе акруговыя і нізавыя газэты і рабсельскораў прыняць наступныя абавязацельствы:

1. Неадкладна пераключыць усю работу на масавую падрыхтоўку да партзьезду: у часе работы зьезду — на лепшае асьвятленьне яго работы, па сканчэньні зьезду — на шырокую папулярызацыю сярод шырокіх мас пастаноў зьездаў КП(б)Б і ЎсеКП(б).

2. Організаваць масавы збор прапаноў рабочых і колгасьнікаў па пытаньнях, якія стаяць у парадку дня XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду ЎсеКП(б), пры гэтым на ўсіх прадпрыемствах організаваць у першую чаргу збор прапаноў рабочых па палепшаньню вытворчасьці і зьніжэньню сабекошту.

3. Павесьці шырокую работу па організацыі новых ударных брыгад імя XVI партзьезду

4. Выступіць пачынальнікамі організацыі напарнага соцспаборніцтва цэхавых парт. і профорганізацый па асноўных галінах партыйнай і профработы.

5. Організаваць ва ўсіх цэхах і колгасах, прымацаваных да кожнай газэты, з мэтаю ўдзелу ў выкананьні гэтага дагавору, апорныя пункты і патрулі газэт.

6. Тэрмін гэтага дагавору (па падрыхтоўцы да партзьезду, асьвятленьні яго ходу і замацаваньні яго пастаноў у масах)—1-га кастрычніка 1930 г.

Вызначэньне соцыялістычнага першынства цэнтральных газэт БССР у соцспаборніцтва на гэтым дагаворы правесьці праз трыбунал газэтнага спаборніцтва пры культпропе ЦК КП(б)Б.

Прыняць, як асноўную меру ацэнкі соцыялістычнага першынства: масавы размах і якасьць праведзенай работы (у сэнсе ўжываньня новых форм, мэтадаў і г. д.).

ЦЭНТРАЛЬНЫЯ ГАЗЭТЫ БССР: „ЗЬВЯЗДА“, „РАБОЧИЙ“ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“, „БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА“.

Па-баявому рыхтавацца да партыйных зьездаў

„Чырвоная Зьмена“, уключаючыся ў соцыялістычнае спаборніцтва паміж газэтамі Беларусі на лепшую організацыю газэтнага паходу—падрыхтоўкі, асьвятленьня і праработкі рашэньняў XVI парт. зьезду ЎсеКП(б) і XIII КП(б)Б, цалкам прымае на сябе абавязацельствы па соцспаборніцтву, якія высунуты газэтамі „Зьвязда“, „Рабочий“ „Савецкая Беларусь“, „Беларуская Вёска“ і „Актябр“

Вялізарнае значэньне партыйных зьездаў, якія падвядуць вынікі пройдзенага шляху соцыялістычнага будаўніцтва СССР і вызначаць далейшыя задачы руху Савецкай краіны па шляху да соцыялізму, неабходнасьць у зьвязку з гэтым мобілізацыі ўвагі ўсёй партыйнай, комсамольскай організацыі, пролетарыяту і ўсіх працоўных вакол пытаньняў, якія будуць абмяркоўвацца на зьездах—вымагаюць ад комсамолу—памочніка партыі, мобілізацыі сваёй і ўвагі працоўнай моладзі на справу найлепшай падрыхтоўкі да партыйнага зьезду глыбокага вывучэньня яго рашэньняў і хутчэйшага праведзеньня іх у жыцьцё.

Час падрыхтоўкі да партзьездаў у комсамоле павінен азнаменавацца: праверкай сваёй дзейнасьці ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва, падагульваньнем вопыту—розных стойных форм, мэтадаў работы організацыі на франтох нашага будаўніцтва клясавай барацьбы, найбольшым разгортваньнем бальшавіцкай самакрытыкі, бязьлітаснай, самай рашучай барацьбой з усякага роду адхіленьнямі ад генэральнай партыйнай лініі і галоўным чынам з правым ухілам, як з самым небясьпечным і „левымі“ загібамі, якія ўзмацняюць пазіцыі правага ўхілу падагульваньнем вопыту і ўсямерным узмацненьнем свайго ўдзелу з шырокім прыцягненьнем мас працоўнай моладзі да нацыянальна-культурнага будаўніцтва, да барацьбы з клясава-варожымі плянамі на ідэолёгічным фронце, на фронце нацыянальна - культурнага будаўніцтва, змагаючыся ў першую чаргу з беларускім нацыянал-дэмократызмам, а таксама з шовінізмам усіх колераў.

Падрыхтоўку да XVI партзьезду павінна праходзіць пад знакам праверкі і ўзмацненьня ўдзелу комсамолу і працоўнай моладзі ў соцыялістычным спаборніцтве і ўдарніцтве, як у прамысловасьці, так і ў вёсцы—саўгасах, колгасах. Наш лёзунг да XVI партзьезду ЎсеКП(б) і XIII КП(б)Б—ніводнага комсамольца па-за ўдарнымі брыгадамі

Наша задача зараз найбольш прыкаваць сваю ўвагу да адной з важнейшых задач соцбудаўніцтва—задачы падрыхтоўкі кадраў, як для прамысловасьці, сельскай гаспадаркі, асабліва як соцсэктару культурнага фронту, так і падрыхтоўкі кіруючых комсамольскіх кадраў.

Работа з беднатой, батрацтвамі з моладзьдзю гэтых соцыяльных праслоек, організацыя працы ў колгасах, пасьпяховае скапчэньне вясеньняй сяўбы, узмацненьне пролетарскага ядра ў організацыі і яго кіруючых органах, узьняцьце політычна-тэорэтычнага ўзроўню комсамольцаў.

Вось асноўныя задачы, да якіх павінна быць прыкована зараз увага комсамолу і ад якасьці выраšэньня якіх патрэбна будзе выходзіць пры вызначэньні таго, наколькі комсамол Беларусі да XVI зьезду ЎсеКП(б) і XIII КП(б)Б выканаў партыйную задачу аб максымальным павароце тварам да задач гаспадарчага будаўніцтва.

„Чырвоная Зьмена“ бярэ гэтыя асноўныя пытаньні для асьвятленьня ў парадку падрыхтоўкі да партзьездаў з тым, каб яшчэ больш згрупаваць увагу організацыі на важнейшых партыйных задачах, каб гэтым самым садзейнічаць найбольшай мобілізацыі ўвагі комсамольцаў і працоўнай моладзі для глыбокага вывучэньня рашэньняў партыйных зьездаў і хутчэйшага праведзеньня іх у жыцьце.

„Ч. З.“ справіцца з пастаўленымі задачамі толькі тады, калі Акруговыя, раённыя організацыі, кожная ячэйка і комсамолец зараз аддадуць сваю ўвагу падрыхтоўцы да зьезду, максымальна мобілізуючы ўвагу мас працоўнай моладзі на вырашэньне пастаўленых задач.

Паўстанцкі рух у Індыі пашыраецца

Паліцыя разьбірае барыкады пабудаваныя паўстанцамі ў Шолапуры

Становішча працоўных мас у савецкім Фуцьзяне

(Корэспондэнцыя з Фуцзяна, зьмешчаная ў кітайскім падпольным органе компартыі „Чырвоны Сьцяг“)

У выніку майскага паўстаньня 1929 году рабочыя і сялянскія масы заходняга Фуцьзяну пізрынулі ўладу шэньшы (служылыя станы) і тухао (кулакоў), організавалі Саветы рабочых, сялянск. і салд. д-таў і зрабілі аграрную рэволюцыю. У цяперашні час Заходні савецкі Фуцзян і тэрыторыя, якая яшчэ знаходзіцца пад уладай Гоміндану, прадстаўляюць сабой два зусім процілеглыя міры. Жыцьцё народных мас пад уладай савецкага ўраду адрозьніваецца ад жыцьця народных мас, якія яшчэ не пазьбеглі гнёту Гоміндану, як неба ад зямлі. Вось некаторыя даныя.

На працягу некалькіх месяцаў барацьбы была організавана боездольная Чырвоная армія і Чырвоная гвардыя, мясцовыя партызанскія атрады, якія налічваюць больш 10 тысяч чалав. Зараз усе сілы накіраваны на тое, каб пашырыць савецкую тэрыторыю, даць адпор карацельным экспэдыцыям і блёкадзе, садзейнічаць паўстаньню прыгнечаных Гомінданам народных мас, спыніць мілітарысцкую грызьню і атрымаць магчымасьць з аружжам у руках выступіць на абарону СССР. Калі выключыць старых і малых з больш чым мільённага насельніцтва працоўных, за Чырвонай арміяй, Чырвонай гвардыяй і Маладой гвардыяй (комсамольскія атрады) стаіць больш 200 тысяч чалавек у запасе.

Савецкі ўрад урэгуляваў арашальную сыстэму на рысавых палёх. Зямельны вучастак кожнага селяніна атрымоўвае зараз усю патрэбную ваду і тым самым захоўваецца ўраджай. Прычыны спрэчак з-за вады, такім чынам, зьнікаюць. Больш таго, усе непаразуменьні, якія ўзьнікаюць паміж сялянамі, хутка вырашаюцца савецкай уладай.

Ва ўсіх сёлах утвораны коопэратывы. Пры пакупцы масла, солі і іншых прадметаў першай неабходнасьці рабочы і селянін не падпарадкаваюцца эксплёатацыі гандляроў.

Многія раённыя саветы ўстанавілі крэдытныя вобчаствы (сялянскія банкі), дзе рабочыя і сяляне атрымоўваюць ссуды. Такім чынам квотніцтву нанесен сьмяротны ўдар.

У паветах аснаваны ленінскія пэдагогічныя курсы, а ў большай палове раёнаў і сёл організаваны школы, якія носяць назву „ленінскіх“. Толькі недахоп пэдагогічнага пэрсоналу і зьверствы гомінданаўскіх генэралаў Ліу Хо-Ціна, Чжан-Чэна, Цін Хан-Ціна робяць цяжкім стварэньне такіх школ усюды. Для сталых усюды ствараюцца вячэрнія курсы. Нарэшце вядзецца энэргічная кампанія па ліквідацыі няпісьменнасьці. У сёлах, кожныя 10 чалавек, мужчыны і жанчыны выбіраюць кіраўніка (настаўніка). Штодня сельсавет зьбірае ўсіх кіраўнікоў і інструктуе іх у пытаньні аб мэтадах настаўніцтва, забясьпечвае іх рэволюцыйнымі сьпевамі і ўсімі матар'яламі, неабходнымі для выхоўваньня рабочых і сялян. У Заходнім Фуцьзяне мужчыны і жанчыны, старыя і дзеці—усе маюць магчымасьць вучыцца.

Сярод дэпутатаў і членаў выканаўчага камітэту маюцца таксама жанчыны. У галіне політыкі экономікі і асьветы жанчыны карыстаюцца тымі-ж правамі, што і мужчыны. На глебе рэволюцыйнай дзейнасьці жанчыны ня ўступаюць мужчынам. Вы стрэнеце іх і ў Чырвонай арміі і ў Чырвонай і Маладой гвардыі, сустрэнеце на дэмонстрацыях і ў бітвах.

Савецкі ўрад выпрацаваў законы па ахове працы, правёў у жыцьцё васьмігадзінны рабочы дзень, павысіла заработную плату, скараціла тэрмін навучаньня і прадставіла рабочым поўную свабоду саюзаў, сходаў і друку.

На тэрыторыі савецкага ўраду няма жабракоў і зладзеяў. Ім таксама прадстаўлена работа і такім чынам яны могуць прымкнуць да рэволюцыі. Немачным і ўбогім урад прадставіў палацы тухао і шэньшы і асыгнаваў на іх харчаваньне досыць значныя сумы.

Гарады і глухія вёскі робяць рэволюцыйнымі лёзунгамі. У адзнаку ад таго, як паступае ў даным выпадку буржуазія, гэтыя лёзунгі пішуцца не на паперы, а проста на сьценах пры дапамозе вапны ці проста якой-небудзь фарбы. Перавага даецца вапне, бо яна доўгі час захоўвае свой колер і ворагам ня лёгка зьнішчыць напісаныя ёю лёзунгі.

Раённыя і сельскія саветы завербавалі ўрачоў, стварылі бясплатныя шпіталі і грамадзкія аптэкі. Раней захварэўшаму селяніну нічога не заставалася, як зварачацца да пуса (будзійскае бажаство). Зараз селянін зварачаецца за дапамогай да Саветаў ня толькі ў політычных пытаньнях, але і ў выпадку самага лёгкага фізычнага недамаганьня.

На тэрыторыі савецкага ўраду на адлегласьці кожных 5 лі ($2^1/_2$ клм.) зроблены перадатачныя станцыі (перадаюць весткі ад аднаго сяленьня другому, пасылаючы бягуноў, вершнікаў і г. д.). Абслугоўваючыя гэтыя станцыі, хоць і не атрымоўваюць вялікай узнагароды, тым ня менш старанна выконваюць свае абавязкі па перадачы навін. Усе працоўныя, даведаўшыся аб добрай ці дрэннай вестцы, адразу-ж дакладваюць Савету. Кожны савет, паміма таго, што тэрмінова паведамляе важныя весткі ў ваенную інстанцыю, ставіць у вядомасьць і астатнія саветы і грамадзкія організацыі па радыусу на 20 лі (10 клм.)

У кожным сяле маецца клюб, які служыць ня толькі для забавы, але і для выхаваньня мас. У гэтым ён радыкальна адрозьніваецца ад клюбаў дзе скача буржуазія. Усе сьцены клюбу ўпрыгожаны лёзунгамі і малюнкамі. Кожны вечар чытаюцца політычныя даклады, аглашаюцца рэволюцыйныя лёзунгі, выступаюць расказчыкі, ставяцца п'есы, організуюцца концэрты.

Вы сустрэнеце вечарам у клюбе ўсё сяло: мужчын, жанчын, старых і дзяцей.

На партконфэрэнцыі прыморскай організацыі ў Гамбурзе

БЭРЛІН, 19. На адчыненым пасяджаньні конфэрэнцыі прыморскай організацыі компартыі ў Гамбурзе прысутнічала каля 800 рабочых. Адным з кульмінацыйных пунктаў конфэрэнцыі зьявіўся момант, калі рабочы, кінуўшы на падлогу свой соцыял-дэмократычны парт. білет, выданы яму 1-га мая 1890 і мандат апошняй раённай конфэрэнцыі нямецкай соцыял - дэмократычнай партыі, паказаў партбілет компартыі са словамі: „вось сапраўдны парт. білет для рабочага“. Вялізнае натхненьне выклікала зьяўленьне некалькіх груп забароненага саюзу чырвоных франтавікоў з сьцягамі. Перад конфэрэнцыяй Верхне-Сілезкай організацыі компартыі ў Гіндэнбурзе адбылася дэмонстрацыя з 5.000 рабочых, якія наладзілі факельны ход да польскай мяжы.

Паветраная бомбардыроўка паўстанцкіх вёсак у Індыі

ЛЁНДАН, 20. Афіцыйныя паведамленьні прызнаюць, што становішча ў вёсках паўночна заходняй правінцыі Індыі, ахопленых паўстанцкім рухам, больш сур'ёзнае, чым да гэтага часу паведамлялася. Шэраг вёсак, якія мелі дачыненьне да выступленьня войск Фына-Хаджы, падпарадкаваўся паветранай бомбардыроўцы. Урадавыя войскі робяць шырокія ваенныя опэрацыі супроць вёсак, зьвязаных з рухам Хаджы і дзейнасьцю сялянскіх паўстанцкіх організацый «Чыр Руб».

Колгасны рух і ўздым сельскай гаспадаркі

(Тэзісы дакладу т. Я. ЯКАЎЛЕВА на 16-м зьезьдзе ЎсеКП(б), ухваленыя Політбюро ЦК УсеКП(б) 18-га мая 1930 г.)

1. Вынікі колгаснага руху

2 з пал. гады, якія прашлі з часу 15-га зьезду партыі, былі пэрыядам вялізарнейшага пералому ў разьвіцьці сельскай гаспадаркі СССР. Гэты пералом характарызуецца тым, што на 1 мая 1930 г. у асноўных збожжавых раёнах вытвараючых абласьцей колектывізацыя ахапіла 40-50 проц. сялянскіх гаспадарак замест 2-3 проц. гаспадарак вясной 1928 г., а пасеўная плошча колгасаў па СССР з 1,5 млн. гэктараў вясной 1928 г. падымаецца, як гэта і прадугледжвалася пастановай Цэнтральнага Камітэту ЎсеКП(б) ад 5 студзеня, прыкладна да 30-35 млн. гэкт. вясной 1930 г., ня лічачы азімага кліну. У выніку гэтага колгасы, разам з савгасамі, ужо ў гэтым 1930 г. дадуць асноўную частку таварнай збожжавай продукцыі мінулых галоў пэрыоду 15-га зьезду і 16-й конфэрэнцыі, калі пераважная частка таварнай збожжавай продукцыі рабілася індывідуальнай, сялянскай, у тым ліку і кулацкай гаспадаркай.

Такім чынам, партыя вырашае на справе асноўную і труднейшую проблему сельскае гаспадаркі—збожжавую проблему.

Сусьветна-гістарычнае значэньне мінулага пераломy ў разьвіцьці СССР заключаецца ў тым, што:

1. Значная часьць серадняцкай масы ў важнейшых збожжавых раёнах, сьледам за беднякамі зразумела пераважнасьці буйнай грамадзканай гаспадаркі, аб'яднаўшыся дабраахвотна ў колгасы і праводзячы сяўбу на колектыўных палёх, і павярнула на соцыялістычны шлях. Тым самым ня толькі тэорытычна даведзена, але і праверана на практыцы мільёнаў людзей магчымасьць пры дыктатуры пролетарыяту непасрэднага пераходу ад адсталае, мала продукцыйнае дробнае і драбнейшае індывідуальнае сялянскае гаспадаркі да буйнае, колектыўнае, высока-продукцыйнае гаспадаркі.

2. На аснове разгортваньня суцэльнай колектывізацыі раду раёнаў СССР партыя адышла ад ранейшай політыкі абмежаваньня і выціcканьня капіталістычных элемэнтаў у вёсцы да новай політыкі—політыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, ажыцьцяўляючы гэту політыку, як непарыўную састаўную часьць суцэльнай колектывізацыі, якая праводзіцца самімі бядняцкімі і серадняцкімі масамі.

3. У выніку масавага разьвіцьця колгасаў і савгасаў і распачатай ліквідацыі кулацтва, мяняюцца самыя суадносіны розных экономічных укладаў у гаспадарцы СССР, паколькі ў дадатак да соцыялістычнага ўкладу, які прадстаўлен прамысловасьцю, вырастае соцыялістычны ў сельскай гаспадарцы СССР, які выціскае капіталістычны ўклад.

4. Соцыялістычныя адносіны ў СССР, якія апіраліся да гэтага часу амаль выключна на соцыялістычную прамысловасьць, з гэтага моманту пачынаюць апірацца таксама і на хутка ўзрастаючы соцыялістычны сэктар (буйная вытворчасьць у выглядзе колгасаў і савгасаў) у сельскай гаспадарцы. Тым самым адкрыта магчымасьць перамогі вялізарнейшай труднасьці пролетарскай рэволюцыі, якая заключаецца ў тым, што „пролетарская ўлада „гатовых" соцыялістычных „адносін" не атрымлівае, калі ня браць самых разьвітых форм капіталізму, якія па сутнасьці ахапілі невялікія вяршыні прамысловасьці і зусім мала яшчэ закранулі земляробства" (Ленін, 7 зьезд партыі, даклад аб вайне і міры, том 22, стар. 316, 2-е выданьне).

5. У адпаведнасьці з усім гэтым па-новаму ставіцца цяпер пытаньне аб апоры савецкай улады ў вёсцы. З гэтага моманту ў важнейшых збожжавых раёнах СССР вёска дзеліцца на дзьве асноўныя часткі: на колгасьнікаў, якія зьяўляюцца сапраўднай і моцнай апорай савецкай улады і на неколгасьнікаў з беднаты і серадняkoў, якія яшчэ пакуль што ня хочуць уваходзіць у колгасы, але якіх масавая практыка колгасаў бясспрэчна пераканае ў адносна карацейшыя тэрміны ў неабходнасьці ўступіць на шлях колектывізацыі.

Зьезд лічыць патрэбным адзначыць, што партыі ўдалося дасягнуць гэтага пералому ў разьвіцьці сельскай гаспадаркі СССР толькі ў выніку:

а) шпаркага тэмпу разьвіцьця індустрыі, якая зьяўляецца ключом да рэконструкцыі сельскай гаспадаркі на колектыўных пачатках,

б) масавага разгортваньня коопэраваньня, організацыі машынна-трактарных станцый і разьвіцьця савгасаў;

в) наступленьня на капіталістычныя элементы вёскі (кулацтва) на базе саюзу з серадняком, які прадстаўляе аснову колгаснага будаўніцтва ў дадны момант;

г) разгрому контр-рэволюцыйнага трацкізму і правага ўхілу.

2. Узмацненьне асноў колгаснага руху ў барацьбе з памылкамі

Замацаваньне дасягнутых посьпехаў у абсягу колектывізацыі і на гэтай аснове далейшае разьвіцьцё колектывізацыі магчымы толькі пры ўмове няўхільнага ўжываньня на практыцы наступных карэнных марксыцка-ленінскіх прынцыпаў колгаснага руху, адступленьне ад якіх зьяўляецца вельмі цяжкім злачынствам супроць дыктатуры пролетарыяту:

1. Колгасы могуць быць пабудаваны толькі на аснове добраахвотнасьці. Усякая спроба ўжываньня гвалту або адміністрацыйнага прымусу ў адносінах да бядняцка-серадняцкіх мас у мэтах іх далучэньня да колектыву, зьяўляецца грубым парушэньнем лініі партыі і злоўжываньнем уладай.

2. Асноўнай формай колгасу на данай стадыі зьяўляецца с-г арцель. Патрабаваць, каб сяляне, уступаючы ў арцель, безадкладна адмовіліся ад усякіх індывідуалістычных навыкаў і інтарэсаў, ад магчымасьці весьці дадатковую да грамадзкае асабістую гаспадарку (карова, авечкі, птушкі, прысядзібны агарод), ад магчымасьці скарыстаньня для сябе заработкаў на баку і г. д.,—значыць забываць азбуку марксызму-ленінізму.

3. Форма колгасаў павінна адпавядаць гаспадарчым асаблівасьцям раёну і галіне гаспадаркі. Побач з арцельлю ў некаторых раёнах нязбожжавага характару, а таксама ў нацыянальных раёнах Усходу, можа мець на першы час масавае пашырэньне таварыства па грамадзкай апрацоўцы зямлі, як пераходная форма да арцелі.

4. Колгасны рух можа падымацца да вышэйшай формы—комуны, у адпаведнасьці з павышэньнем тэхнічнай базы, ростам колгасных кадраў і культурнага ўзроўню колгасьнікаў пры абавязковай умове прызнаньня самімі сялянамі адпаведных зьмен у статуце і'іх ажыцьцяўленьня зьнізу.

5. Неабходнае для дасягненьня вышэйшай продукцыйнасьці працы стварэньне ў колгасах новай грамадзкай дысцыпліны можа быць дасягнута толькі на аснове сапраўднай самадзейнасьці і актыўнага ўдзелу колгасьнікаў у кіраўніцтве гаспадаркай колектыву.

6. Пераход да колектыўнага земляробства можа быць ажыцьцёўлен, як гэта ня раз указваў Ленін, толькі пры ўмове аказаньня колгасам шырокай організацыйнай, матар'яльнай і фінансавай дапамогі з боку савецкай дзяржавы. „Кожны грамадзкі лад узьнікае толькі пры фінансавым падтрыманьні пэўнай клясы" (Ленін, „О коопэрацыі", том 18, частка 2-ая, стар. 141).

7. Антыленінскай зьяўляецца ўсякая спроба перанясеньня на колгасы організацыйнай сыстэмы кіраўніцтва савгасамі, бо ў адрозьненьне ад савгасу, які зьяўляецца дзяржаўным прадпрыемствам, створаным на сродкі дзяржавы, колгас зьяўляецца добраахвотным грамадзкім аб'яднаньнем сялян, створаным на сродкі саміх сялян з усімі выцякаючымі адсюль вынікамі.

8. Пераход ад гаспадаркі індывідуальнай да гаспадаркі колектыўнай можа ажыцьцявіцца толькі на аснове саюзу рабочае клясы і беднаты з серадняком, што абавязвае да сыстэматычнага прыцягненьня серадняков да колгаснага кіраўніцтва.

Выходзячы з усяго гэтага, зьезд лічыць асабліва важным усьведамленьне кожным членам партыі характару тых памылак і скажэньняў лініі партыі, якія мелі месца вясной гэтага году ў практыцы правядзеньня колектывізацыі. Гэтыя памылкі і скажэньні выяўляліся ва ўжываньні мер прымусу і гвалту ў адносінах да серадняkoў і беднякоў пры пабудове колгасаў; у абагульненьні ў членаў арцелі дробнае жывёлы і кароў, якія маюць спажывецкае значэньне; у перанясеньні на нязбожжавыя раёны тэмпаў колектывізацыі, апраўдаўшых сябе на практыцы і прадугледжаных пастановамі ЦК толькі ў адносінах збожжавых раёнаў; у скарасьпелым стварэньні комун без адпаведнай матар'яльнай і організацыйнай падрыхтоўкі: у стварэньні пад выглядам колгасаў-„гігантаў"—нежыцьцёва-бюрократычных організацый, пабудаваных на прынцыпах камандваньня; у затрыманьні прызначаных урадам для колгасаў крэдытаў і пазбаўленьні колгасьнікаў даных урадам ільгот; у грубым адміністраваньні ў адносінах да колгасаў і колгасьнікаў і замене выбарнасьці назначэнствам, камандаваньнем зьверху; у заціраньні серадняка і нескарыстаньні яго гаспадарчай практыкі; у перанясеньні на серадняка мер барацьбы, накіраваных супроць кулака („раскулачваньне", пазбаўленьне выбарчых праваў і г. д.).

Сутнасьць гэтых памылак і галоўнейшых скажэньняў лініі партыі, атрымаўшых пашырэньне асабліва ў радзе раёнаў спажываючай паласы і ў нацыянальных рэспубліках і абласьцёх Усходу СССР, Цэнтральны Камітэт у сваёй адозьве ад 2-га красавіка акрэсьліў наступным чынам: «Політыка ўмацаваньня саюзу з серадняком пры апоры на беднату і бязьлітаснай барацьбе з кулацтвам стала падмяняцца наскрозь варожай ленінізму політыкай камандваньня ў адносінах да серадняка". (Адозва ЦК ад 2 красавіка 1930 г.).

Калі-б гэтыя памылкі ня былі сваячасова выпраўлены Цэнтральным Камітэтам партыі (пастанова ЦК ад 20-II, 10-III, 17-III, 2-IУ і артыкулы т. Сталіна «Галавакружэньне ад посьпехаў» і «Адказ таварышом-колгасьнікам»),—гэта пагражала-б зрывам справы колектывізацыі сельскай гаспадаркі, падрывам самае асновы савецкае дзяржавы—саюзу рабочае клясы з сялянствам.

Усе меры, прынятыя Цэнтральным Камітэтам для выпраўленьня памылак, дапушчаных у практыцы колектывізацыі, у выніку звадзіліся да ўстанаўленьня правільных ленінскіх адносін да серадняка, парушаных у радзе раёнаў, да замацаваньня дасягненьняў колгаснага руху і да ажыцьцяўленьня політыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай колектывізацыі і і ў саюзе з серадняком.

Рэзультатам выпраўленьня памылак партыйных і савецкіх органаў зьяўляецца той факт, што ў рашаючых збожжавых раёнах індывідуальнікі энэргічна праводзяць сяўбу пры аднячасовым павялічэньні ліку найбольш устойлівых колгасаў, якія могуць стаць для асноўных сялянскіх мас гэтых раёнаў ядром будучага колгаснага руху.

3. Аб тэмпах колектывізацыі і задачах перабудовы сельскай гаспадаркі

Ход разгортваньня веснавой сяўбы ў 1930 г. паказвае, што на аснове колектывізацыі і насаджэньня савгасаў партыі ўдаецца дабіцца вырашэньня труднейшай збожжавай проблемы. Вырашэньне збожжавай проблемы ў сваю чаргу ня толькі палягчае ў далейшым разьвіцьцё тэхнічных культур і жывёлагадоўлі, але і вырашае пытаньне аб магчымасьці шляхам разьвіцьця колектыўнай і дзяржаўнай гаспадаркі выхаду іншых галін сельскай гаспадаркі з труднасьцяй непераможных для малапродукцыйнай дробнай і драбнейшай гаспадаркі.

Магчымыя тэмпы далейшага разьвіцьця збожжавай гаспадаркі і перамаганьня крызісу жывёлагадоўчай гаспадаркі акрэсьліваюцца тымі вялізнымі магчымасьцямі разьвіцьця продукцыйных сіл, якія тояць у сабе колгасы.

Ужо гэтай вясной ня толькі старыя міжсяленныя машынна-трактарныя станцыі і старыя колгасы, але і новыя колгасы, пабудаваныя на аснове простага ўлажэньня сялянскага інвэнтара ня маючыя яшчэ выстарчальнай організацыйнай, гаспадарчай практыкі, здолелі значна пашырыць свае пасеўныя плошчы і пусьціць у ход закінутыя землі і цаліны. Апрача таго, магчымасьці, што адкрываюцца з разьвіцьцём савгасаў, характарызуюцца тым фактам, што адны савгасы (старыя і новыя) дадуць ужо ў гэтым годзе каля 100 млн. пудоў таварнага збожжа, а ў будучым годзе—ня менш 250 млн. пудоў таварнага збожжа. Гэта паказвае, што на аснове колектывізацыі, разьвіцьця машынна-трактарных станцый і організацыі савгасаў партыя можа пачаць ажыцьцяўляць лёзунг „дагнаць і перагнаць" капіталістычныя краіны сьвету ня толькі ў адносінах прамысловасьці, дзе перавагі буйное гаспадаркі ўжо даўно выкрыліся з вялізарнай сілай, але і ў абсягу сельскай гаспадаркі, тэмпы разьвіцьця, якое да гэтага часу акрэсьліваліся пераважнасьцю крайня мала продукцыйнай дробнай і найдрабнейшай гаспадаркі, а зараз будуць акрэсьлівацца паскораным разьвіцьцём колгасаў і савгасаў, якія прадстаўляюць сабою новы тып гаспадаркі, нячуваны ў гісторыі чалавецтва і ўпяршыню адкрыты практыкай гаспадарчага будаўніцтва ў СССР.

У адпаведнасьці з гэтым зьезд лічыць неабходным:

1) карэнным чынам перагледзець пяцігадовы плян разьвіцьця сельскай гаспадаркі, выходзячы з тэмпаў колектывізацыі, прадугледжаных пастановай Цэнтральнага Камітэту ад 5-га студзеня і поўнасьцю пацьверджаных на практыцы, з тым, каб на гэтай аснове забясьпечыць побач з паскораным разьвіцьцём збожжавых і тэхнічных культур, падняцьце і ўзмоцненае разьвіцьцё жывёлагадоўлі шляхам, перш за ўсё разьвіцьця спэцыяльных жывёлагадоўчых савгасаў аналёгічна збожжа-савгасам і масавага стварэньня высокатаварных колгасных фэрм:

2) побач з няўхільным захаваньнем прадугледжаных пастановамі партыі ільгот колгасам і колгасьнікам, павялічыць у 1930-31 гадзе крэдыты колгасам у два разы супроць бягучага году, г. зн. да 1 мільярду рублёў;

3) забясьпечыць засеў па лініі зернятрэсту ў будучым годзе ня менш 4 з палов. млн. гэктараў і падрыхтоўку да пасеву 1932 году 9 млн. гектараў;

4) забясьпечыць таварны выхад на лініі Сьвінатрэсту сьвіней у 1930-31 годзе ня менш 400 тыс., у 1931-32 г. ня менш 3 млн. штук, у 1932-33 г. —ня менш 7 млн. штук.

5) давесьці лік штук стада „Скотовода" ў 1930-31 годзе да 3,2 млн. штук, у 1931-32 г. 5,5 млн. штук, у 1932-33 г.—да 9-10 млн. штук.

6) разьвіваць жывёлагадоўчыя галіны ў калгасах, накіраваўшы на гэту справу значную частку с.-г. крэдытаў;

7) даручыць с.-г. акадэміі імя Леніна распрацаваць пытаньне аб раяянальным пашырэньні сельскай гаспадаркі на тэрыторыі СССР па галінах культурах; аб замене менш выгодных культур больш выгоднымі культурамі; аб забясьпечаньні СССР магчымасьці самастойнага забесьпэчаньня галоўнейшымі харчовымі і тэхнічнымі культурамі; аб магчымасьці максымальнага скарыстаньня ў земляробстве водных крыніц энэргіі.

У адпаведнасьці з задачамі, ўскладаюцца на с.-г. акадэмію Леніна, стварыць для яе работы трэбную тэхнічную базу, якая стаіць на ўзроўні апошніх дасягненьняў навукі і забясьпечыць яе ўзмацненьне комуністычнымі кадрамі;

8) разгарнуць работу Колгаснага інстытуту з тым, каб яго работа забяспечыла сваечасовую навукова-апэрацыйную распрацоўку форм і мэтадаў колгаснага будаўніцтва і тэорэтычнае абсталяваньне вопыту месц;

9) забясьпечыць поўнае выкананьне програмы трактарабудаўніцтва і вытворчасьці трактарнага прычэпнага інвэнтару ў разьмерах вызначаных пастановамі ЦК.

4. Аб падрыхтоўцы масавага колгаснага руху ў нязбожжавых раёнах

Зьезд зварачае ўвагу ўсіх партыйных організацый нязбожжавых раёнаў а таксама ўсходніх рэспублік і абласьцей СССР на неабходнасьць разгортваньня ў гэтых раёнах вялікай падрыхтоўчай работы да масавага колгаснага руху. Гэта падрыхтоўчая работа перш за ўсё павінна складацца з:

1) разьвіцьця коопэрацыйнай організацыі бядняцкага і серадняцкага сялянства, пачынаючы з пасёлкавых таварыстваў і спэцыяльна вытворча-бытавых коопэрацыйных аб'яднаньняў,

2) масавага пашырэньня таварыстваў па грамадзкай апрацоўцы зямлі, як першапачатковай формы колгасу, пераходнай да арцелі;

3) усямернага ўзмацненьня існуючых колгасаў і разгортваньня сеткі машынна-трактарных станцый;

4) насаджэньня савгасаў, асабліва бавоўняных, малочна-агародных, ільняных, жывёлагадоўчых:

5) узмоцненага наступленьня на кулака ў сэнсе далейшага абмежаваньня яго эксплёататарскіх тэндэнцый і яго росту, ва ўсямерным разьвіцьці організацыі беднаты;

6) узмацненьня работы па выпрацоўцы тыпу буйное гаспадаркі ў лінах, характэрных для даных раёнаў і організацыі вытворчасьці машын, якія садзейнічаюць пастаноўцы гаспадаркі (машыны для сяўбы, апрацоўкі і ўборкі ільну, канапель, машыны насадкі і апрацоўкі бульбы, машынна-агародны інвэнтар, машыны для буйных малочных фэрм і г. д.

Асаблівую ўвагу зварачае зьезд на абсолютную недапушчальнасьць аднэнкі існуючых у гэтых раёнах колгасаў толькі таму, што іх ёсьць вясной гэтага году 7-8 процантаў замест тых, якія лічыліся раней на паперы. Зьезд лічыць недапушчальным ігнараваньне гэтых колгасаў, маючы на ўвазе тыку колектывізацыі ў збожжавых раёнах, дзе летась лік колгасаў перавышаў ліку колгасаў, які ёсьць у спажываючай паласе і дзе та вялікая кольнасьць колгасаў грала важнейшую ролю у далейшым разьвіцьці ўсяго колгаснага руху, колькі ў асобе колгасаў ствараліся ўзоры і прыклады для ўсёй сялянскай масы, з іх выкоўваліся кадры, стаўшыя пры далейшым разгортваньні колгаснага руху організатарамі масавай колектывізацыі.

5. Узаемаадносіны колгасаў з індывідуальнікамі

Улічваючы ўсю складанасьць надыходзячага ў бліжэйшыя гады поўнага пераходу ад дробна-індывідуальнае гаспадаркі да буйное колектыўнае, асабліва пры наяўнасьці на вялізнай тэрыторыі Усходу СССР дакапіталістычнага ўкладу і адсутнасьці яшчэ масавых узораў буйной гаспадаркі ва ўсіх нязбожжавых раёнах,—зьезд папярэджае партыйныя організацыі ад якога-б там ні было ігнараваньня індывідуальнае гаспадаркі, якая ў радзе раёнаў краю будзе існаваць яшчэ адносна доўга.

Устанаўленьне правільных адносін да індывідуальнае гаспадаркі, якія-б у далейшым палягчалі колектывізацыю, становіцца ў значнай меры пытаньнем аб узаемаадносінах колгасьнікаў і індывідуальнікаў. Абвостраныя адносіны паміж колгасьнікамі і індывідуальнікамі, якія ўстанавіліся вясной гэтага году ў выніку адыходаў з колгасаў і барацьбы найбольш актыўных і адданых справе колектывізацыі колгасьнікаў для захаваньня колгасаў, зьяўляюцца тормазам далейшай колектывізацыі.

Таму зьезд абавязвае ўсе партыйныя організацыі дабіцца таго, каб ва ўзаемаадносінах колгасьнікаў і індывідуальнікаў ўстанавіліся правільныя, цкаваць індывідуальнікаў, а аказваць ім дапамогу і ўсямерна прыцягваць да колгасу.

Зьезд катэгорычна асуджае маючае месца ігнараваньне коопэрацыйнай формы організацыі індывідуальных беднякоў і серадняkoў і разьвіцьцё якое зьяўляецца адной з важнейшых умоў паступовага пераходу да колгасаў.

Зьезд лічыць груба няправільнай маючую месца ў радзе раёнаў ліквідацыю нізавых форм прасьцейшай коопэрацыйнай організацыі (пасёлкавыя таварыствы і спэцыяльныя вытворча-збытавыя таварыствы) і прапануе партыйным організацыям безадкладна забясьпечыць аднаўленьне і далейшы рост коопэрацыйнай організацыі, аказваючы ёй адпаведнае організацыйнае і фінансавае падтрыманьне.

6. Організацыйныя пытаньні колгаснага руху

1. Стварэньне колгасных кадраў зьяўляецца аднэй з важнейшых умоў узмацненьня колектывізацыі. У аснову работы над стварэньнем колгасных кадраў павінна быць пакладзена вылучэньне новых кадраў з масы саміх колгасьнікаў. Гэта-ж зьяўляецца важнейшай задачай накіраваных на работу ў колгасы 25 тыс. рабочых, з якіх многія ўжо пасьпелі праявіць сябе дасканалымі організатарамі колгаснай гаспадаркі і заваявалі аўторытэт сярод колгасьнікаў у асаблівасьці ў тых выпадках, калі яны ставілі сваёй галоўнай задачай дапамагаць вырошчваньню новых кадраў з саміх колгасьнікаў.

Партыя выходзіць з таго, што ў бліжэйшыя год-два з масы колгасьнікаў бязумоўна вылучацца пад узьдзеяньнем перадавых рабочых дзесяткі тысяч сапраўдных організатарскіх талентаў, якія стануць сапраўднымі будаўнікамі соцыялізму.

Галоўнымі задачамі ў гэтай галіне зьяўляюцца:

а) організаваць сыстэму вылучэньня на кіраўнічую работу кадраў, якія асяродзішча саміх колгасьнікаў;

б) паставіць масавую кароткатэрміновую падрыхтоўку колгасных кадраў пры савгасах, школах сялянскай моладзі, клюбах, с.-г. тэхнікумах, школах другой ступені і машына трактарных станцыях;

в) шырэй прыцягваць у с.-г. ВНУ і тэхнікумы колгасную моладзь;

г) шырока разгарнуць організацыю і работу вытворчых нарад і дэлегацкіх сходаў у колгасах;

д) організаваць у колгасах дэлегацкі сход колгасьніц. Пабудаваць работу такім чынам, каб забясьпечыць вырошчваньне колгасных кадраў з жанчын і іх вылучэньне.

Канец чытай на 3-й стар.

Колгасны рух і ўздым сельскай гаспадаркі

(Тэзісы дакладу т. Я. ЯКАЎЛЕВА на 16-м зьезьдзе ЎсеКП(б) ухваленыя Політбюро ЦК УсеКП(б) 18 мая 1930 г.)

(Канец. Пач. глядзі на 2-ой старонцы)

2. Цяперашні стан коопэрацыйнай організацыі і коопэрацыйнага апарату, якія адарваліся ад абслугоўваньня масы індывідуальнікаў і ў той-жа час ні ў якай меры не прыстасаваліся да справы організацыйнага і вытворчага кіраўніцтва колгасамі, зьяўляецца недапушчальным. У адпаведнасьці з гэтым зьезд лічыць неадкладным карэнны перагляд усёй організацыйнай структуры колгасна-коопэрацыйнай сыстэмы, для чаго патрэбна:

а) функцыі організацыйна-вытворчага кіраўніцтва колгасамі (кадры, організацыя працы, тэхнічная база, у раёне згуртаваць у адносінах усіх колгасаў раёну ў адзіна раённых сельгассаюзах, ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыемстваў правесьці ў галінах, у якіх колектывізавана ня менш 30 проц. усіх сялянскіх гаспадарак;

б) функцыі вытворчага абслугоўваньня і кіраўніцтва ў адносінах да індывідульных гаспадарак і прасьцейшых аб'яднаньняў, а таксама функцыі нарыхтоўчыя ў адносінах усіх відаў гаспадарак, сконцэнтраваць у раённым с.-г. коопэрацыйным саюзе;

в) ліквідаваць прамежныя акруговыя зьвеньні колгасна-коопэрацыйнай сыстэмы, рашуча ўзмацніць за іх кошт нізавыя зьвеньні колгасна-коопэрацыйнай сыстэмы;

г) перагледзець лік спэцыялізаваных цэнтраў па важнейшых галінах сельскае гаспадаркі;

д) правесьці рашучае скарачэньне адміністрацыйнага апарату коопэрацыі і спыніць самымі рашучымі мерамі разбуханьне апарату ў колгасах, ускладаючы выкананьне адміністрацыйных функцый у колгасах, як правіла на выбарных асоб з асяродзішча колгасьнікаў.

3. Работа груп беднаты першапачатковых форм колектыўных гаспадарак павінна быць палепшана і ўзмоцнена. Партыйныя організацыі колгасаў павінны забясьпечыць такую пастаноўку работы груп беднаты, каб яны ня толькі абаранялі непасрэдныя інтарасы беднаты, але і дапамагала узмацненьню саюзу рабочае клясы і вясковай беднаты з серадняками.

4. Увесьці патрэбныя зьмены і прыкладны статут с.-г. арцелі згодна ўказаньняў практыкі і вопыту работы арцеляй.

5. Распрацаваць прыкладны статут ТСОЗ і комуны.

У аснову прыкладнага статуту ТСОЗ паложыць аб'яднаньні працы членаў ТСОЗ за час пасеву і ўборкі і набыцьця за лік даходаў таварыства складаных машын і іншых сродкаў вытворчасьці агульнага ўладаньня і карыстаньня.

У аснову прыкладнага статуту комуны пакласьці поўнае абагуленьне ўсіх без выключэньня сродкаў вытворчасьці, а таксама паступовае стварэньне ўстаноў і прадпрыемстваў па абслугоўваньні патрэб колгасьнікаў (сталоўка, грамадзкія жыльлёвыя будынкі і інш.), ні ў якім выпадку не падмяняць гэтых задач непатрэбным і шкодным дробным аграмаджаньнем быту.

Партыі ўдалося ў прайшоўшы паміж XV і XVI зьездамі пэрыод дабіцца рашаючага пералому ў мэтах колектывізацыі сельскае гаспадаркі. Калі конфіскацыя зямлі ў памешчыкаў была першым крокам Кастрычніцкай рэволюцыі ў вёсцы, то пераход да колгасаў зьяўляецца другім і црытым рашаючым крокам, які падкрэсьлівае важнейшы этап у справе пабудаваньня фундаманту соцыялістычнага грамадзтва ў СССР. Зразумела, што такі найвялікшы пераварот, як пераход ад індывідуальнай, дробнай сялянскай гаспадаркі да буйнай аграмаджанай гаспадаркі нямінуча зьвязан з радам вялізарных труднасьцяй, якія выклікаюцца абвастрэньнем супраціўленьня клясавых ворагаў унутры краіны і наяўнасьцю капіталістычнага акружэньня звонку.

Таму толькі бюрократы і чыноўнікі, а не рэволюцыянэры, магуць думаць, што пераварот такога значэньня, які датычыць самых асноў ладу гаспадаркі і жыцьця вялізных мас, можа быць ажыцьцёўлен бяз труднасьцяй, без абвастрэньня клясавай барацьбы і зьвязаных з гэтым хістаньняў серадняка. Кулак яшчэ не дабіт і будзе аказваць шалёнае супраціўленьне пераможнаму прасоўваньню колектывізацыі. Ліквідацыя кулацтва, як клясы, патрабуе доўгай упартай барацьбы з кулаком, сыстэматычнай работы над правядзеньнем колектывізацыі і павінна разгортвацца ў поўнай адпаведнасьці з ажыцьцяўленьнем суцэльнай колектывізацыі, як яе неадлучная частка.

У арцелях не завяршаецца, а толькі пачынаецца справа стварэньня новай грамадзкай дысцыпліны, справа навучаньня сялян соцыялістычнаму будаўніцтву. У колгасах сяляне канчаткова паабавяцца дробна-ўласьніцкай псыхолёгіі, вострага жаданьня прыватнагаспадарчага накапленьня, атрыманага ў спадчыну ад пакаленьняў дробных прыватных уласьнікаў, у выніку гадоў упартай работы над падвядзеньнем пад колгасы базы буйнай мэханізаванай гаспадаркі ўпартай работы над стварэньнем кадраў з асяродзішча саміх колгасьнікаў і культурнага ўздыму ўсёй колгаснай масы.

Партыя дабілася рашаючага пералому ў справе колектывізацыі, дзякуючы таму, што былі разгромлены як контррэволюцыйны троцкізм, політыка якога няўхільна вяла да разрыву з асноўнымі масамі сялянства, так і правыя ўхілістыя з іх політыкай адмаўленьня ад праводзімай партыяй індустрыялізацыі краю, адмаўленьня ад насаджэньня савгасаў і разьвіцьця колгасаў, з іх політыкай капітуляцыі перад кулацтвам.

Партыя дабілася рашаючага пералому ў справе колектывізацыі, няўхільна ажыцьцяўляючы політыку індустрыялізацыі краю, тым самым стварала ўмовы для разьвіцьця вытворчых форм змычкі сялянства, узмацняючы саюз рабочае клясы і вясковай беднаты з серадняком. Толькі такім шляхам партыя магла стварыць патрэбныя ўмовы для колгаснага будаўніцтва. Толькі такім шляхам партыя даб'ецца ня толькі замацаваньня дасягнутых посьпехаў, але і завершыць справу колектывізацыі, кладучы тым самым фундамэнт соцыялістычнага грамадзтва.

Аб абгаварэньні тэзісаў да 16 партзьезду

Пастанова Політбюро ЦК УсеКП(б) ад 18-гая 1930 г.

1. Апублікаваць ухваленыя Політбюро ЦК тэзісы да 16-га зьезду ЎсеКП(б) для абгаварэньня іх на партсходах і ў друку.

2. Выдаць пры „Правде“ „Дыскусійны лісток“, у якім друкаваць крытычныя артыкулы, папраўкі да тэзісаў ЦК, конкрэтныя прапановы да тэзісаў і г. д.

Левін „зразумеў“ самакрытыку

На пасяджэньні бюро Парыцкага РК КСМ была ўнесена юнкорамі прапанова паставіць на агульным сходзе даклад аб „Чырвонай Зьмене“ і абгаварыць яе працу. Але выступіў член бюро РК т. Левін і заявіў:—„Гэта гучныя фразы, цэнтр павінен нам указваць недахопы, а ня мы яму. У нас моладзь газэт ня чытае, таму слухаць даклад аб „Чырвонай Зьмене“ няма для чаго“.

Юнкор Хведар.

Бярэце прыклад з ячэйкі Профмайстэрняў

Яч. профмайстэрні ў Прапойску, дзякуючы энэргічнай працы сваіх упаўнаважаных тав. Борыкава і Якушэнка на 200 проц. выканала сваю кантрольную лічбу па выпісцы „Чырвонай Зьмены“. Гэта амаль адзіная ячэйка ў Прапойску, дзе добра пастаўлена праца з „Чырвонай Зьменай“. Некаторыя ячэйкі (профэсыйная і Нова-Слабодзкая) ўпарта не жадаюць вылучаць асобных упаўнаважаных па „Чырвонай Зьмене“. Раім усёй комсамольскай організацыі ўзяць прыклад з ячэйкі профмайстэрняў.

Стэрлінг.

У бойку са стратамі

„...ВУЧЭЦЕСЯ Ў КОЖНАЙ ДРОБЯЗІ РЭВОЛЮЦЫЮ сусьветную ЗНАЙСЬЦІ...“

Вялікія сродкі неабходны для выкананьня пяцігадовага пляну соцыялістычнага будаўніцтва. 4 мільярды рублёў штогодна ідуць на вецер дзякуючы стратам, якія зьяўляюцца вынікам безгаспадарнасьці і бясплянавасьці

Адваюем чатыры мільярды

„...Ва што абыходзяцца нам усе гэтыя страты? Па самых грубых падліках выяўленых страт у народнай гаспадарцы мы трацім каля чатырох мільярдаў рублёў у год...“

(Газэта „Труд“ № 132 (2761)

Па самых простых, прыблізных падліках наша краіна траціць каля 4 мільярдаў рублёў у год. Гэтыя чатыры мільярды роўны дзесяткам новых фабрык і заводаў тыпу Магнітбуду, Днепрабуду, Асінбуду і інш. Гэтыя чатыры мільярды рублёў маглі-б зьявіцца вялікім дапаможнікам у справе яшчэ большага разгортваньня нашага будаўніцтва, у справе выкананьня пяцігодкі ў найкарацейшы тэрмін.

І вось у той час, калі многія фабрыкі і заводы абвяшчаюць сябе ўдарнымі, у выкананьні прамфінпляну у нас на некаторых заводах з вялікімі перабоямі дымяць трубы, шмат электраэнэргіі прападае штодзённа бяз усякай карысьці, дзесяткі варштатаў і машын застаюцца беспрацоўнымі дзякуючы няўменьню правільна разьмяркоўваць рабочую сілу, сыравіны.

Дзе-ж яны, страты?

Чатыры мільярды рублёў, або дзесяткі магутных фабрык і заводаў складаюцца з самых звычайных, самых невялічкіх дробязяй. Вельмі часта гэтыя дробязі ўваходзяць у жыцьцё прадпрыемства і становяцца зусім няпрыкметнымі, становяцца „абавязковымі“, „нормальнымі“.

Юнкор Г. БІЛЬ піша, што ў упаковачным цэху фабрыкі „Везуві“ пануе паўнейшы хаос, усюды раскінуты скрынкі сярнічак, іх топчуць нагамі. Нядаўна ўстаноўленыя конвэеры праз некаторы час былі зьняты. Клей неэканомна скарыстоўваецца.

У аўта-транспартным трэсьце—піша „Рабін“—меў месца выпадак з камандыроўкай у Маскву. Жадаў ехаць намесьнік дырэктара, які павінен быў атрымаць за 5 дзён камандыровачных 226 рублёў. Замест яго, з такім-жа посьпехам мог-бы паехаць сам дырэктар, які не зьяўляючыся спэцам павінен быў атрымаць 105 рублёў. Гэтыя 121 рубель розьніцы маглі-б пайсьці на вецер дзякуючы капрызу асобнага адміністратара.

У Гомельскай друкарні „Полесдрук“—піша Т. Т.,—адміністрацыя рашыла пабудаваць пад'ёмныя машыны. Пабудову машын даручылі людзям, якія не знаёмы з гэтай справай. Работа цягнецца ўжо 8 месяцаў, патрачаны вялікія сродкі, а конкрэтных вынікаў ня відаць.

Юнкор Г. Кугель піша, што на тэрыторыі пабудовы макароннай фабрыкі (Нова-Барысаў) ляжыць пад адкрытым небам і ржавее каля 250 пудоў жалезнага лому. Адміністрацыя ня прымае ніякіх захадаў, каб перадаць гэты лом у Рудмэтальгандаль і скарыстаць яго на патрэбы нашай прамысловасьці. Так, з прычыны безгаспадарнасьці, нячуласьці да прапаноў рабочых гінуць тысячы рублёў, гінуць вялікія горы неабходнай нам сыравіны і матар'ялу.

У нас не хапае жалеза для заводаў і фабрык. Магутныя плавільныя печы патрабуюць стравы. Колгасныя палі чакаюць трактароў і машын, а ў гэты час сотні пудоў каштоўнага мэталю гіне дзякуючы галавацяпскім адносінам некаторых адміністратараў.

Мы маем страты ня толькі на вытворчасьці. У лік чатырох мільярдаў уваходзяць і страты, якія выклікаюцца нерацыянальнай організацыяй выдачы зарплаты рабочым і служачым на прадпрыемствах і ўстановах. Аплату працы трэ' было-б наладзіць так, каб ня губляўся рабочы час на хаджэньні ў цэхавую або заводзкую кантору за палучкай, а гэта ўпарадкаваньне дало-б дзяржаве немалую эканомію.

Страты на транспарце выяўляюцца ў спазьненьні цягнікоў, бяспуцьці. Страты ў сельскай гаспадарцы—у дрэннай апрацоўцы зямлі, недастатковай ураджайнасьці і г. д. Страты ў соцыяльна-бытавым абслугоўваньні рабочых—у чаканьні ў чаргах, у больніцах, крамах і г. д.

Гэтыя чатыры мільярды рублёў павінны быць „злоўлены“ і аддадзены на справу выкананьня пяцігодкі. Бясплянавае скарыстаньне сродкаў ёсьць яўнае шкодніцтва. Гэтым стратам павінен быць паложан канец. На нашых прадпрыемствах яшчэ не разгорнута па-сапраўднаму барацьба са стратамі. Вельмі часта гэта пытаньне ня ідзе далей голых размоў. На прапановы рабочых падчас не зьвяртаюць увагі.

Комсамольскія ячэйкі яшчэ да гэтага часу не аддаюць патрэбнай увагі пытаньню барацьбы са стратамі.

Організаваць барацьбу

Першыя зьвесткі з фронту выкананьня прамфінпляну сьведчаць аб тым, што за другую палову другога году пяцігодкі прамфінплян выконваецца больш пасьпяхова, што прарывы, якія былі ў некаторых заводах, пасьпяхова ліквідуюцца дзякуючы настойлівасьці рабочай клясы, дзякуючы ўпартай барацьбе з ілжэ-ударніцтвам і шкодніцтвам і г. д.

На барацьбу са стратамі на вытворчасьці павінны быць мобілізаваны ўсе сілы. Барацьба са стратамі павінна стаць баявой задачай дня.

Існуючыя на заводах групы сяброў варштатаў павінны сачыць, каб варштаты ніводнай хвіліны не стаялі дарма. Не працавалі ўхаластую трансмісіі і маторы.

Комсамольскія ячэйкі і ўдарныя брыгады павінны мобілізаваць грамадзкую думку вакол пытаньня барацьбы са стратамі. Шляхам выданьня спэцыяльных лісткоў, насьценгазэт неабходна выкрываць шкоднікаў, якія дапускаюць гэтыя страты, нядбайна адносяцца да матар'ялаў і варштатаў.

Групы „Лёгкай Кавалерыі“ павінны праверыць ажыцьцяўленьне прапаноў рабочых, каб ніводная з іх не прападала дарма. Яны павінны праверыць наколькі рацыянальна выкарыстоўваюцца матар'ялы, адкіды і абсталяваньне.

Неабходна мобілізаваць маладых вынаходцаў і рацыяналізатараў для ажыўленьня працы груп рацыяналізацыі, для мінімальнага скарачаньня непатрэбных выдаткаў.

Толькі пры організацыі грамадзкай думкі, пры організацыі ўсіх унутраных сіл мы забясьпечым барацьбу са стратамі, дамо нашай вытворчасьці 4 мільярды рублёў—дзесяткі новых асінбудаў, і дапаможам выканаць пяцігодку ў найкарацейшы тэрмін.

Л. ГЛЕЗЕР.

Там, дзе пануе безгаспадарнасьць

Цэмант, цэгла, жалеза, дошкі і іншыя будаўнічыя матар'ялы ў вялікай колькасьці расходзяцца на пабудовах і зьяўляюцца дэфіцытнымі матар'яламі. У іх, пры нашым разгорнутым будаўніцтве, адчуваецца вялікі недахоп. Выходзячы з гэтага, барацьба з стратамі, з нерацыянальным выкарыстаньнем матар'ялаў на будаўніцтве набывае вельмі важнае значэньне. Усё-ж, ня гледзячы на гэта, асобныя гаспадарнікі няўважліва адносяцца да матар'ялу.

Адміністрацыя пабудовы Унівэрсытэцкага гарадка ня прымае ніякіх мер да больш эканомнага расходваньня матар'ялаў.

Цэлыя горы бітай цэглы высяцца на пабудове. У гэтых кучках шмат цэлых цэглін і палавінак, якія яшчэ можна скарыстаць, але па загаду адміністрацыі яны таўкуцца на шчэбень.

Алебастравыя пліты для вэнтыляцыйных карабоў ляжаць ля самай штагі на самым хаду і шмат іх ужо папсавалася.

Яшчэ адзін характэрны факт «гаспадарнасьці» адміністрацыі.

Пабудове не хапае цьвікоў, трэба адшукаць які небудзь выхад. І... знаходзяць.

З старых дошак вырываюцца цьвікі, якія пасьля выроўніваюцца і выкарыстоўваюцца там, дзе ня можна ўжываць старых, а неабходны новыя.

А ў гэты час.

Дзе набіваюць дранку ля сьцен, ляжаць рассыпаныя новыя цьвічкі, —яны пойдуць у сьметнік. Аб гэтым гаварылі рабочыя, але адміністрацыя на гэта не зварочвае ўвагі.

Ні профсаюз, ні комсамольская організацыя ня дбаюць аб больш эканомным скарыстаньні матар'ялаў. Рабочы камітэт пабудовы ніколі ня ставіць перад рабочымі гэтага пытаньня. А рабочыя шмат маглі-б зрабіць, каб з'эканоміць матар'ял. Комсамольская ячэйка пабудовы гэтую працу таксама прахлопала.

І. Сокал

Аб буйных „дробязях“

„Лёгкая кавалерыя“ менскай абутковай фабрыкі разам з рабкорамі зрабіла налёт з мэтаю праверкі, як вядзецца барацьба са стратамі на вытворчасьці. Налёт выявіў, што ў загатоўчым цэху дрэнна скарыстоўваецца просты клей. Калі клей засыхае, яго выкідаюць. Гатовыя фольгі валяюцца па цэху. Тлумачыцца гэта тым, што ў кожнай пачцы не хапае належнай колькасьці фольг. Рабочыя бяруць з новай пачкі, а рэшту раскідаюць.

У машынным аддзяленьні з клеем абыходзяцца як і ў загатоўчым цэху. Вельмі многа раскідаюць цьвікоў. Абы як рэжуць шкляную паперу. Газу, масла разьліваюць па памяшканьні, не падстаўляюць ніякай пасудзіны, каб гэтыя каштоўныя матар'ялы не прападалі дарма.

У складзе загатоўчага аддзяленьня заўсёды гарыць электрычнасьць, калі асьвятленьня там зусім не патрэбна. У загатоўчым аддзяленьні каля машын гарыць электрычнасьць нават у той час, калі там ніхто не працуе. У тым-жа аддзяленьні ўхаластую працуюць 14 машын толькі таму, што сваечасова ня здымаюцца прыводныя пасы.

Бывае, што фабрыку не забясьпечваюць належнай сыравінай. Былі выпадкі, калі фабрыка стаяла з-за адсутнасьці стабаліна. Скурсындыкат дасылае такі матар'ял, у якім фабрыка ня мае патрэбы - яго прыходзіцца адсылаць назад. Абутковай фабрыцы неабходна разгарнуць барацьбу са стратамі, бо такое становішча можа хутка давесьці да дрэнных вынікаў.

Леў

VIII Менская акруговая партконфэрэнцыя

Спрэчкі па дакладу сэкратара ЦК КП(б)Б т. Гея аб рабоце ЦК

На вячэрнім пасяджэньні 19 мая конфэрэнцыя абмяркоўвала даклад тав. **Гея** аб рабоце Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б.

Тав. **Ластоўскі** ў сваім выступленьні спыніўся на пытаньнях сельскае гаспадаркі, у прыватнасьці, ён гаварыў аб жывёлагадоўлі.

— Жывёлагадоўля, сказаў т. Ластоўскі, ва ўмовах Беларусі мае вялікае значэньне. Між тым, крэдытныя органы не садзейнічалі пасьпяховаму вырашэньню праблемы жывёлагадоўлі. Толькі за апошні год у гэтым напрамку мы маем пэўны пералом. У 1929-30 годзе на разьвіцьцё жывёлагадоўлі ў параўнаньні з мінулымі гадамі асыгнаваны вялікія крэдыты. Мы павінны забясьпечыць рацыянальнае і правільнае скарыстаньне адпушчаных сродкаў.

Тав. **Гершон** гаворыць аб посьпехах колгаснага будаўніцтва. Ён адзначае, што веснавая сяўба ў колгасах БССР у асноўным праходзіць добра. Гэта выклікае новы прыліў у колгасы. Рашучае выпраўленьне памылак і перагібаў і посьпехі колгасаў у правядзеньні сяўбы бясспрэчна яшчэ больш павялічаць гэты прыліў. Тут патрэбна паставіць пытаньне аб кадрах для колгаснага будаўніцтва.

Тав. **Гурло** ў сваёй прамове канстатаваў, што Цэнтральны Камітэт праводзіў непрымірымую барацьбу з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі. Потым прамоўца спыніўся на недахопах у падрыхтоўцы кадраў. Тав. Гурло сказаў, што ў праграмах ВНУ ёсьць пэўны разрыў паміж тэарытычнай вучобай і практычнай падрыхтоўкай.

Тав. **Чорны** падкрэсьліў, што ў рэзультаце бальшавіцкага кіраўніцтва з боку ЦК КП(б)Б мы дабіліся вялікіх посьпехаў на ўсіх франтох і вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Пераходзячы да пытаньняў работы прамысловасьці, т. Чорны спыняецца на прарывах у выкананьні прамфінпляну. Асобныя партыйныя арганізацыі ня здолелі мабілізаваць рабочую масу на барацьбу за прамфінплян, ня здолелі стаць на чале творчай актыўнасьці рабочых. Гэта зьяўляецца адной з асноўных прычын прарываў у выкананьні промфінпляну. Канкрэтна т. Чорны гаварыў аб прарывах на фабрыцы „Чырвоная Бярэзіна“.

З вялікай прамовай выступіў у спрэчках т. **Будзінскі**. Тав. Будзінскі падкрэсьліў, што КП(б)Б і яе бальшавіцкі ЦК падыходзяць да свайго XIII зьезду пад знакам вялікіх дасягненьняў. Аб гэтых дасягненьнях мы павінны гаварыць, каб хутчэй ліквідаваць недахопы і памылкі, меўшыя месца ў рабоце асобных таварышоў і арганізацый, каб пасьпяхова ісьці наперад.

Потым т. Будзінскі перайшоў да пытаньняў барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам. Было-б памылкай, сказаў прамоўца, гаварыць, што нацыянал-дэмакратызм разьбіты да канца, што барацьба з нацыянал-дэмакратызмам скончана. Тав. Будзінскі падкрэсьлівае, што ў барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам мы дабіліся рашаючых посьпехаў. Партыя бязьлітасна выкрывала і выкрывае нацыянал-апартуністых і нацыянал - дэмакратаў. Партыйныя масы павінны своечасова даваць жорсткі адпор усялякім праяўленьням нацыянал-апартунізму і нацыянал-дэмакратызму.

Закранаючы пытаньне гаспадарчага будаўніцтва, т. Будзінскі адзначае рад вялікіх дасягненьняў партыі і рабочае клясы на гэтым фронце.—У барацьбу за выкананьне прамфінпляну, падкрэсьліў прамоўца, уцягнута ўся рабочая маса, гэта барацьба стала барацьбой рабочых мас.

У колгасным будаўніцтве, сказаў далей тав. Будзінскі, ня гледзячы на асобныя памылкі, якія мы прызнаём, па бальшавіцку крытыкуем і выпраўляем, мы маем 13 проц. колектывізаваных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Колектывізаваная плошча дасягае 18 проц.

Тав. **Харытонаў** завастрыў увагу канфэрэнцыі на задачах барацьбы з усялякімі ўхіламі ад лініі партыі, як з правым ухілам—галоўнай небясьпекай, так і з „левымі“ загібшчыкамі.

Далей выступілі т. т. **Шульман, Хонік, Вайновіч.**

На ранішнім пасяджэньні 20 мая працягваліся спрэчкі па дакладу ЦК КП(б)Б.

— КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК дала рашучы адпор праяўленьням правага ўхілу ў нацрабоце, гаворыць т. **Альтман.**

Далей т. Альтман спыняецца на тым, што рэарганізацыя партыйнага апарату і ў сувязі з гэтым ліквідацыя нацыянальных бюро пры ЦК і акругкомах, выклікалі ў некаторых камітэтах і ў асобных партыйцаў няправільнае разуменьне гэтай рэарганізацыі. Некаторыя таварышы меркавалі, што з ліквідацыяй нацбюро можна аб рабоце сярод нацыянальных меншасьцяў і ня думаць.

— Гэта, таварышы, няправільна. Мы з ліквідацыяй нацбюро павінны ў той-жа час узмацніць нацыянальную работу па лініі прафсаюзаў, па савецкай лініі і г. д. Ня ўсюды гэта робіцца. Таксама ёсьць многа недахопаў у пытаньнях работы ў мястэчках. ЦК, па маёй думцы, павінен зьвярнуць на гэта сур'ёзную ўвагу.

— Пытаньні своечасовага забесьпячэньня прамысловасьці сырцом і матар'яламі зьяўляліся і зьяўляюцца актуальнейшымі. Правільнае кіраўніцтва ЦК у гэтай галіне прывяло нашу рэспубліку да вялікіх дасягненьняў. Але ёсьць яшчэ асобныя арганізацыі, якія недапушчальна адносяцца да выкананьня дырэктыў партыі і зварачаюць невыстарчальную ўвагу на забесьпячэньне прадпрыемстваў і калгасаў. Да такіх арганізацый можна аднесьці Скуртрэст. З прычыны дрэннага забесьпячэньня, гаворыць т. **Голан,** —менская абутковая фабрыка страціла звыш 300 рабочых дзён.

— Я лічу, заявіў т. Голан, што дапускаць такое галавацяпства і страту рабочага часу злачынна.

Тав. **Маўчанскі** ў сваім выступленьні спыняецца на пытаньнях забесьпячэньня саўгасаў і калгасаў. Ён сказаў, што Белсельтрэст несвоечасова забясьпечыў цэлы рад калгасаў патрэбнымі будаўнічымі матар'яламі.

Арганізацыі, якія ня выконваюць дырэктыў ЦК у гэтай галіне, павінны безадкладна выправіць гэты прарыў. Дырэктывы ЦК павінны быць поўнасьцю выкананы.

Тав. **Хамко**, адзначаючы правільную палітычную лінію ЦК, гаварыў аб пытаньнях будаўніцтва. Ён сказаў, што будаўнічыя організацыі невыстарчальна кіруюць будаўніцтвам, што гэтаму пытаньню аддаецца слабая ўвага.

Т. т. **Ліц і Майсейчык** у сваіх выступленьнях гаварылі аб калгасным будаўніцтве, аб тым, што асобныя партработнікі яшчэ да гэтага часу не жадаюць прызнаваць сваіх памылак, чым бясспрэчна дапамагаюць клясаваму ворагу.

Потым прамоўцы падкрэсьлілі, што ЦК правільна па бальшавіцку мабілізаваў партыйныя масы на ліквідацыю памылак і недахопаў, дапушчаных у радзе месц у калгасным будаўніцтве.

— ЦК КП(б)Б і пад яго кіраўніцтвам уся КП(б)Б праводзілі цьвёрдую лінію ў барацьбе з правым апартунізмам, з „левымі“ загібамі і прымірэнчымі адносінамі да іх. Адначасова праведзена велізарная работа па выкрыцьці нацыянал-апартунізму і нацыянал-дэмакратызму—гаворыць т. **Бачароў.**

Значнае месца ў спрэчках па дакладу заняло пытаньне аб беларусізацыі. Дэлегацыі канфэрэнцыі падкрэсьлілі неабходнасьць рашучага ўзмацненьня беларусізацыі.

Затым у спрэчках выступалі т. т. **Налівайка, Бэйлін, Рай, Мэеровіч.**

Пасьля спрэчак выступіў спатканы бурнымі воплескамі з заключным словам тав. **Гей.**

Пасьля заключнага слова канфэрэнцыя аднагалосна прыняла першы пункт рэзалюцыі па дакладу ЦК, у якім канфэрэнцыя палітычную лінію ЦК КП(б)Б за час ад XII зьезду КП(б)Б да XIII лічыць правільнай і работу здавальняючай.

З дакладам аб рабоце ЦКК КП(б)Б і НК-РСІ выступіў тав. Калнін.

ЛЕПШЫХ КОМСАМОЛЬЦАЎ У ВАЙСКОВЫЯ ШКОЛЫ

Начальнік аб'яднанай беларускай вайсковай школы тав. **Васілевіч** у гутарцы з нашым супрацоўнікам аб ходзе вярбоўкі ў вайсковыя школы, паведаміў наступнае:

Вярбовачная кампанія ў вайсковыя школы па ўсёй Беларусі ня гледзячы на дырэктывы ЦК КП(б)Б ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ і іншых організацый **разгортваецца вельмі павольна.** У цэлым шэрагу акруг дырэктыва аб вярбоўцы ў вайсковыя школы **не даведзена да прадпрыемстваў і буйных колгасаў.**

Вярбовачныя акруговыя камісіі ў сваёй большасьці працуюць пры дапамозе дырэктыў.

Некаторыя організацыі, як Полацкі Акрвыканком і Акрана ня ідуць насустрач вярбовачнай камісіі, як у матар'яльных адносінах, так і забясьпечаньні выкладчыкамі курсаў па падрыхтоўцы адабраных кандыдатур у вайсковыя школы, ня гледзячы на тое, што на гэта ёсьць дырэктыва ЦК УсеКП(б).

Комсамольскія організацыі на сёньнешні дзень **не зьяўляюцца штурхачамі ў справе вярбоўкі ў вайсковыя школы.** К прыкладу можна прывесьці віцебскі АК ЛКСМБ, які ў гэтым стасунку ня даў нават ніякіх дырэктыў РК ЛКСМБ.

Весткі, якія маюцца ў цэнтральнай вярбовачнай камісіі, гавораць аб тым, што соцыяльны склад і парткомсамольскае ядро падаўшых і залічаных кандыдатамі ў вайсковыя школы не адпавядаюць тэй установцы, якая дадзена ЦК УсеКП(б)

Гэтымі днямі сэкратарыят ЦК КП(б)Б заслухаў даклад цэнтральнай вярбовачнай камісіі аб ходзе вярбоўкі ў вайсковыя школы. Сэкратарыят рашыў паставіць пытаньне перад АК КП(б)Б і АК ЛКСМБ аб хутчэйшым разгортваньні кампаніі па вярбоўцы ў вайсковыя школы. Скласьці вакол гэтай кампаніі грамадзкую думку і ўва што-б там ні стала выканаць усе нормы як у соцыяльных адносінах, так і па партыйна-комсамольскай праслойцы.

Трэба безадкладна прыступіць да організацыі падрыхтоўчых курсаў для паступаючых у вайсковыя школы. Дабіцца таго, каб на кожнае вакантнае месца было ня менш 5-6 **кандыдатаў,** каб адпаведныя організацыі адпусьцілі сродкі для організацыі курсаў.

Комсамольскія організацыі павінны безадкладна прыступіць да гэтай важнейшай работы. Паслаць лепшых комсамольцаў у вайсковыя школы.

Х. Б.

Усебеларуская экскурсія рабочай моладзі на Украіну, організаваная „Чырвонай Зьменай“

Рэйс пачаты

Сустрэча

(Ад нашага спэцыяльнага корэспондэнта)

15-га мая а 2 з паловай гадзіне дня на вакзале Гомелю сустракалі старшыню СНК БССР тав. Галадзеда і нашу экскурсію-дэлегацыю.

Даўжэзная калёна вайскоўцаў—праз увесь пэрон узьняла блішчастыя шаблі.

Кароткія прывітаньні на пэроне, ледзь чутна шэпча кіно-апарат. Экскурсія-дэлегацыя пад гукі оркестру організаваным парадкам выходзіць на прывакзальны пляц.

А тут, на пляцы, застыглі ў чаканьні калёны комсамольцаў, рабочых, працоўнай моладзі, піонэры і вучні гораду Гомелю. Шэрагі экскурсантаў выходзяць на пляц і ў гонар ім далёка нясецца шматгалосае дужае—„У-р-ра!“ На грузавік узыходзіць сэкратар гомельскага АК ЛКСМБ тав. Рубін. Ён, перадаючы прывітаньне экскурсіі ад імя комсамолу і рабочай моладзі Гомелю, адчыняе мітынг.

— Слова мае т. Галадзед.

— Мы прымусілі малярыйныя асінаўскія балоты зьмяніць сваё аблічча. На вялікіх балотных багнах шпарка расьце асінаўская электрычная станцыя імя Сталіна, якая ў жніўні месяцы прывядзе ў рух тысячы варштатаў, дзесяткі заводаў і фабрык. Тав. Галадзед гаворыць аб дасягненьнях у соц. будаўніцтве БССР.

Савецкая Украіна таксама багата незьлічонымі дасягненьнямі соц. будаўніцтва. На Украіне—Днепрабуд. На Украіне буйнымі крокамі ідзе ўперад будаўніцтва пролетарскай нацыянальнай культуры. Вы едзеце на Украіну. Прымеце ў зьвязку з гэтым маё гарачае бальшавіцкае прывітаньне ад імя ЦККП(б)Б і ўраду БССР. Мой наказ:

— Пакажэце рабочай клясе і ўсёй рабочай моладзі Савецкай Украіны, як Беларусь лапцюжная, раней здратаваная белапалякамі, цяпер шпарка ператвараецца ў краіну агра-індустрыяльную. Раскажэце аб нашых посьпехах, дасягненьнях рабочай клясы, магчымых толькі пры дыктатуры пролетарыяту. Перадайце працоўным Украіны наш лепшы вопыт, падзяліцеся з імі нашай барацьбой, вывучэце будаўніцтва Савецкай Украіны і лепшы вопыт што ёсьць у комсамоле і ў рабочай клясе УССР перанясеце на нашыя варштаты, заводы, у нашы колгасы, узбагацеце гэтым самым сваю барацьбу, на фронце соцыялістычнага будаўніцтва.

Сустрэча была гарачай, прывакзальны пляц у хвіліны сустрэчы быў напоўнен тысячамі працоўных. Было люба глядзець на вялікае мноства юнгштурмавак, адчуваць цяплыню сустрэчы тысячамі. Сярод гэтых тысяч працоўных гомельчан, —ля трыбуны стаяла калёна экскурсантаў. На рукавох блішчэлі чырвоныя зорачкі з надпісам—БССР. На пляцы, дзе адбываўся мітынг, панавала цішыня. І калі канчаў прамоўца—гучна несьліся воплескі і „Інтэрнацыянал“.

Таварыш Брынскі ад імя ўзброенага вайсковага комсамолу гаварыў аб падрыхтоўцы вайны з боку імпэрыялістых, аб вучобе „ком[...] мольцаў вайскоўцаў.

Прадстаўнік рабочых Сталін[...]га раёну перадаў гарачае пр[...]тарскае вітаньне дэлегацыі.

Тав. Азаронак ад імя ЦК ЛК[...] і экскурсіі заверыў прысут[...] пролетараў, што экскурсія вы[...]нае усе дадзеныя тут наказы, [...]канае пастаўленыя задачы.

Пад музыку даўжэзная кал[...] рухалася ў горад...

... І такая любая сало[...]

У той-жа дзень у вялікім чы[...]начным клюбе імя Леніна адбы[...] вечар комсамольцаў і рабочай [...]ладзі, прысьвечаны сустрэчы д[...]гацыі. Была кароткая афіцый[...] частка і даклад тав. Самуціна [...] задачах экскурсіі. А пасьля—[...]становўка БелТРАМ'у „Першы Шт[...]дар“. Вечар пакінуў незабыў[...] ўражаньне. Дэлегаты, змора[...] паездкай, упачы да сьмеху [...]ранна „працавалі“ відэльцамі і [...]жамі ў сталоўцы № 2.

Частка дэлегатаў начавала ў [...]тэрнатах і чалавек 60 у піонэр[...] клюбе.

Там, дзе цяпер Гомельскі [...]радзкі піонэрскі клюб, яшчэ „з[...] нядаўна была царква.

Мы начавалі на другім паве[...] гэтага клюбу—былой царквы, [...]пакатай вялікай падлозе—на [...]ломе.

Бывай, Гомель...

Такім чынам мы едзем ў Кіеў [...] параходзе „Чычэрын“. Мы па[...] адыходзім на рацэ ад аздобле[...] лёзунгамі прыстані, на якой ба[...]ліва, неяк спужана і недалу[...] варушыцца кіно-апарат. І гола[...] дужа голасна і сакавіта пады[...]юцца з прыстані прывітаньні... [...] адплываем.

Доўгі час застаецца бачным Г[...]мель з шматлікімі высокімі ды[...]рамі і вясновымі садамі ў зелян[...] і цьвеце.

У Гомелі частка экскурсант[...] наведала парк імя Луначарск[...] былы парк князя Паскевіча. Не[...]торыя экскурсанты былі ў му[...] Яны дзівіліся з вялічэзнага ло[...] княгіні Паскевіч, на якім так до[...] было-б паспаць мінімум 15 экску[...]сантам, замест таго, каб царапа[...] на шэнкай шчакатлівай сал[...] пад столью былой царквы.

Мы едзем у Кіеў. Нас цікаві[...] цяпер рака, параход, новыя ў[...]жаньні.

Мы ў трэцяй клясе на пер[...] паверсе параходу. На парахо[...] дужа модна. Аздоблены „Чы[...]рын“—гэты адзін з лепшых д[...]роўскіх параходаў—неяк ня[...] адчувае сябе на квелых груд[...] Сожу. Штодзень Сож робі[...] мяльчэйшым і штодзень цяжэй [...]раходнай камандзе весьці па [...] вялікі пасажырскі параход „Чы[...]рын“.

МІХ. ВЯРНІКОЎСК[...]

Параход „Чычэрын“ 17 мая.

Адчынілася мазырская акруговая партконфэрэнцыя

17 мая, а 6 гадз. увечары, у клюбе дрэваапрацоўшчыкаў адчынілася VI Мазырская акруговая партконфэрэнцыя. У ганаровы прэзыдыум конфэрэнцыя пад бурныя воплескі абрала т. т.: Сталіна, Варашылава і Арджанікідзэ.

Конфэрэнцыяй пасланы пр[...]тальныя тэлеграмы тав. Сталіну ЦК КП(б)Б.

З дакладам аб працы ЦК КП(б)[...] выступіў тав. Чарвякоў.

Я. Сандамірскі.

Паштовая скрынка.

Басіну—„Не дапамагаюць“, Чарнушэвічу—„Хлусьнёю займацца ня варта“. Комсамольцу—„Правы ўхіл на практыцы“ Надпліну—„Больш фармальнасьці, чымся справы“ Васільцу—„Калі ён прыдзе“ Чарэўке—„Профтэхшкола не адпавядае свайму прызначэньне“ Чэрароону —„Справа Гурвіча“, Сухарукаву—„Чакаем дапамогі“, [...]каму Кавалярысту—„Соц. спабор[...]тва на дзеле“ Кажамячку—„Засн[...]на, але не працуе“, Іважке Б. [...]ток зьвестак“, Карпінскаму—„Спа[...]на—і ціха“, Зорнаму—„Падрыхт[...] кадры—вашы допісы друкавацца будуць. Дробязныя факты.

Паведамленьні

МЕН. АК ЛКСМБ. 22-У, а 6-ай гадзіне ўвечары, у памяшканьні АК склікаецца паседжаньне прыймовай камісіі. Яўка сяброў камісіі абавязкова. На паседжаньне камісіі выклікаюцца наступныя таварышы: Гопман П., Ліўшыц Р., Багдановіч Х., Маслакова Н., Шарамовіч А., Сарокіна А., Сямашка В., Пенчанскі В., Мілько З., Аўрух А., Фішкін Ю., Чарняўскі А., Зусман Ф., Рывін Л., Фрыдлянд Л., Казінік І., Гутэрман З., Рэйтблат П., Шапіра Н., Брытава Т., Казінік І., Мускі Г., Бутрыс М., Міхайлаў А., Грыц [...] Медшыкава Г., Пекар І., Кабако[...] Г., Іваноў В., Сянько С.

Фрунзэўскі РК ЛКСМБ—22-га м[...] а 7-ай гадзіне ўвечары ў пам[...]каньні ФРК ЛКСМБ склікаецца [...]лектыў павадыроў раёну па [...]таньню організацыі раённай [...]фэты ў часе М. Т.

Адказны рэдактар —Рэдколег[...]